# БЮЛЕТЭНЬ №3

VERAS
2024

ВЕРАС
2024

GRODNO | 28-29 SEPTEMBER

ГРОДНА | 28-29 ВЕРАСНЯ

ORIENTEERING CLUB
VERAS

# БЮЛЕТЭНЬ №3

# РЭСПУБЛІКАНСКІЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПА СПАРТЫЎНАМУ АРЫЕНТАВАННЮ «ВЕРАС 2024»

## Этапы Кубка БФА сярод эліты, ветэранаў і юнакоў

### Прысвячаюцца памяці Чылек Ірыны Аляксандраўны

## АРГАНІЗАТАРЫ

КСА "Верас", Гродзенская абласная федэрацыя арыентавання, СГА “Беларуская федэрацыя арыентавання”, Упраўленне спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама

- Галоўны суддзя – Баўшэвіч Ганна (+37529 8676088)
- Намеснік галоўнага суддзі па дыстанцыях – Шванц Аляксей
- Галоўны сакратар – Красько Наталля (+37529 7845476)
- Кантралёр БФА – Давідовіч Дзмітрый
- Інспектар – Крапіўка Дзмітрый
- Журы: Давідовіч Дзмітрый, Салодкін Сяргей, Марчанка Андрэй

## МЭТЫ І ЗАДАЧЫ

Спаборніцтвы праводзяцца з мэтай развіцця і папулярызацыі спартыўнага арыентавання ў Рэспубліцы Беларусь і Гродзенскай вобласці.
Асноўнымі задачамі стартаў з’яўляюцца:

– паляпшэнне спартыўнага майстэрства ўдзельнікаў;
– прывабліванне вучняў да сістэматычных заняткаў фізічнай культурай і спортам;
– вызначэнне наймацнейшых спартоўцаў.

## ДАТА І МЕСЦА

27-29 верасня 2024 года, Беларусь, г. Гродна.

## ПРАГРАМА

**27.09.2024 (пятніца)**
Прыбыццё каманд.

**28.09.2024 (субота)**

- 10:00-12:00 – рэгістрацыя на арэне спаборніцтваў (турбаза “Мелавыя горы” г. Гродна), каардынаты размяшчэння - 53.713172, 23.770647, рэгістрацыі - 53.714555, 23.769974;
- 12:15 – адкрыццё спаборніцтваў;
- 13:00 – пачатак старту на доўгай дыстанцыі (этап юнацкага рэйтынгу, кубка БФА сярод ветэранаў), на сярэдняй дыстанцыі на ровары (этап кубка БФА па арыентаванні на ровары);
- 13:00-14:00 – старт Open-груп.

**29.09.2024 (нядзеля)**

- 10:00-11:00 – рэгістрацыя на арэне спаборніцтваў (лясны масіў па завулку Перамогі), каардынаты - 53.652218, 23.817708;
- 11:00 – пачатак старту на сярэдняй дыстанцыі (этап юнацкага рэйтынгу, кубка БФА сярод эліты і ветэранаў, этап Кубка Гродзенскай вобласці для груп МЖ12-18, МЖ21), на спрынтарскай дыстанцыі на ровары (этап кубка БФА па арыентаванні на ровары);
- 11:30-12.30 – старт груп МЖ8 і Open-груп;
- 14:30-15:30 – узнагароджванне пераможцаў і прызёраў, а таксама ўсіх удзельнікаў групы МЖ8. Закрыццё спаборніцтваў.

## УДЗЕЛЬНІКІ І ГРУПЫ

Да ўдзелу запрашаюцца зборныя абласцей, раёнаў, гарадоў, каманды клубаў, а таксама спартоўцы, якія выступаюць асобна. Склад каманд не абмежаваны.
Спаборніцтвы адбудуцца па наступных групах:
МТВО Ж21, МТВО М21, МЖ75, МЖ65, МЖ55, МЖ45, МЖ35, МЖ21Е, МЖ20, МЖ21А, МЖ18, МЖ16, МЖ14, МЖ12, МЖ10, МЖ8, Open1 (складаная), Open2 (простая). Старт МЖ8 толькі 29 верасня. Для Open1, Open2, МЖ8 старт ажыццяўляецца па падыходу, магчыма суправаджэнне ўдзельнікаў.
**На дыстанцыю арыентавання на ровары дапускаюцца спартоўцы ў шлемах і са спраўным роварам.**
**Дыстанцыя МЖ8 будзе з адзнакай кампосцерамі без вызначэння пераможцаў.**
**У групы МЖ8 дзеці без вопыту дапускаюцца толькі з суправаджэннем дарослых.**
**Для груп МЖ8, МЖ10 дыстанцыі без маркіроўкі.**

## АДЗНАКА

На спаборніцтвах будзе выкарыстоўвацца сістэма адзнакі SPORTident. Дапускаецца выкарыстанне асабістых SI-чыпаў любой серыі. Будзе магчыма выкарыстанне бескантактнай сістэмы SPORTident AIR+.
У груп МЖ8 адзнака будзе ажыццяўляцца кампосцерам у месцы з адпаведным малюнкам, надрукаваным на мапе.

## 28.09.2024 (субота) – мапа « Мелавыя горы», доўгая дыстанцыя бегам і сярэдняя дыстанцыя на ровары

***Мапа і мясцовасць.***





Лес змяшаных парод рознай ступені праходнасці. На адкрытых месцах (ЛЭП і кар’еры) высокатраўе амаль без крапівы, але сустракаюцца зараснікі ажыны. Рэльеф водна-эразіўны з вышынёй схілаў да 30 м. Развітая сетка сцежак ды дарог. Частка сцежак – гэта матацыклетныя і роварныя (некаторыя матацыклетныя магчыма адсутнічаюць на мапе). Прысутнічаюць элементы фартыфікацыі: траншэі, варонкі, капаніры.
**Небяспечныя месцы**: крутыя схілы лагчын, высокія абрывы на берагах кар’ераў, магчым выезд матацыклістаў.
На просецы з ЛЭП ідуць работы па пракладцы труб.
**Аварыйны азімут** – на захад да ракі Нёман

Маштаб: 1:10000, сячэнне 5 м;
для арыентавання на ровары – маштаб 1:12500, сячэнне 5 м, фармат А4.
Аўтар мапы: Верабей Сяргей, 2023-2024 гг.
Памер знакаў дыстанцыі паменшаны на 20%
Каардынаты месцазнаходжання: [53.712022, 23.772370]
Легенды будуць выдавацца ў стартавым калідоры.
Уваход у стартавы калідор за 4 хвіліны да свайго стартавага часу.

***Схема арэны 1 дня спаборніцтваў***



***Параметры доўгай дыстанцыі, сярэдняй на ровары***

| Група | Даўжыня дыстанцыі, км | Колькасць КП | Група | Даўжыня дыстанцыі, км | Колькасць КП |
|---|---|---|---|---|---|
| М21Е | 12,6 | 29 | Ж21Е | 8,0 | 20 |
| М75 | 2,7 | 9 | Ж75 | 2,7 | 9 |
| М65 | 4,3 | 14 | Ж65 | 2,7 | 9 |
| М55 | 4,8 | 13 | Ж55 | 3,5 | 11 |
| М45 | 5,7 | 19 | Ж45 | 4,3 | 14 |
| М35 | 8,0 | 20 | Ж35 | 5,7 | 19 |
| М21А | 5,7 | 19 | Ж21А | 4,8 | 13 |
| М20 | 8,0 | 20 | Ж20 | 5,7 | 19 |
| М18 | 6,8 | 16 | Ж18 | 4,8 | 13 |
| М16 | 5,7 | 19 | Ж16 | 3,5 | 11 |
| М14 | 4,1 | 13 | Ж14 | 3,4 | 10 |
| М12 | 3,5 | 11 | Ж12 | 2,7 | 8 |
| М10 | 2,5 | 7 | Ж10 | 2,2 | 6 |
| Open1 | 5,5 | 18 | Open2 | 3,4 | 10 |
| МТВО М21 | 10,2 | 18 | МТВО Ж21 | 7,8 | 14 |

***Кантрольны час і пункты падсілкавання***

| Група | Час, хв | Пункты падсілкавання | Група | Час, хв | Пункты падсілкавання |
|---|---|---|---|---|---|
| М21Е | 200 | 4,2 км; 7,6 км | Ж21Е | 160 | 4,5 км |
| М75 | 120 | | Ж75 | 120 | |
| М65 | 120 | - | Ж65 | 120 | - |
| М55 | 120 | - | Ж55 | 120 | - |
| М45 | 120 | 3,1 км | Ж45 | 120 | - |
| М35 | 150 | 4,5 км | Ж35 | 140 | 3,1 км |
| М21А | 140 | 3,1 км | Ж21А | 120 | 2,3 км |
| М20 | 150 | 4,5 км | Ж20 | 120 | 3,1 км |
| М18 | 120 | 3,9 км | Ж18 | 110 | - |
| М16 | 120 | - | Ж16 | 110 | - |
| М14 | 100 | - | Ж14 | 100 | - |
| М12 | 100 | - | Ж12 | 100 | - |
| М10 | 100 | - | Ж10 | 100 | - |
| Open1 | 120 | - | Open2 | 120 | - |
| МТВО М21 | 120 | - | МТВО Ж21 | 120 | - |

# ТРАНСПАРТ

Самастойна. Арэна спаборніцтваў знаходзіцца ў пешай даступнасці ад прыпынкаў грамадскага транспарту.

Аўтобусамі 6, 24, 34 да прыпынку "Паліклініка", далей пешшу 2,4 км.

***Схема, як даехаць ці дайсці на 1 дзень спаборніцтваў***



## 29.09.2024 (нядзеля)

## мапа «Нівасан», сярэдняя дыстанцыя бег і спрынт на ровары.



***Мапа і мясцовасць.***
Лесапарк змяшаных пародаў больш дрэннай ступені праходнасці, месцамі з зараснікамі крапівы. На адкрытых месцах высокатраўе амаль без крапівы. Мясцовасць сярэдняй перасечанасці. Развітая сетка сцежак ды дарог. Прысутнічаюць элементы фартыфікацыі: траншэі, варонкі, капаніры.
**Небяспечныя месцы**: месцы стыхійных сметнікаў, выгул сабак, рух транспарту ў гаражах (для ровараў).
**Аварыйны азімут** – на захад ці на поўдзень да дарогі, на ўсход да гарадской забудовы.

Маштаб: 1:7500, сячэнне 2,5 м; для арыентавання на ровары – 1:7500, сячэнне 2,5 м.
Аўтары мапы: Верабей Сяргей, Манкевіч Уладзіслаў, Куніцкая Анастасія, Госцік Наталля, 2023-2024 гг.
Каардынаты месцазнаходжання: [53.652218, 23.817708]
Легенды будуць выдавацца ў стартавым калідоры.
Уваход у стартавы калідор за 4 хвіліны да свайго стартавага часу.
Для груп М21Е і М20 карта будзе надрукавана на двух баках ліста.

***Схема арэны 2 дня спаборніцтваў***



***Параметры сярэдняй дыстанцыі, спрынту на ровары***

Кантрольны час для ўсіх груп – 90 хвілін

| Група | Даўжыня дыстанцыі, км | Колькасць КП | Група | Даўжыня дыстанцыі, км | Колькасць КП |
|---|---|---|---|---|---|
| M21E | 5,3 | 27 | Ж21Е | 3,7 | 20 |
| M75 | 1,6 | 9 | Ж75 | 1,6 | 9 |
| M65 | 2,4 | 14 | Ж65 | 1,6 | 9 |
| M55 | 3,3 | 17 | Ж55 | 1,6 | 9 |
| M45 | 3,4 | 18 | Ж45 | 2,4 | 14 |
| M35 | 3,7 | 20 | Ж35 | 3,3 | 17 |
| M21A | 3,3 | 17 | Ж21А | 2,4 | 14 |
| M20 | 5,3 | 27 | Ж20 | 3,7 | 20 |
| M18 | 3,4 | 18 | Ж18 | 2,4 | 14 |
| M16 | 3,3 | 17 | Ж16 | 2,1 | 12 |
| M14 | 2,9 | 15 | Ж14 | 2,4 | 12 |
| M12 | 2,8 | 11 | Ж12 | 2,2 | 9 |
| M10 | 1,7 | 7 | Ж10 | 1,5 | 6 |
| M8 | 0,7 | 5 | Ж8 | 0,7 | 5 |
| Open1 | 3,2 | 17 | Open2 | 2,4 | 12 |
| MTBO M21 | 5,4 | 15 | MTBO Ж21 | 4,3 | 14 |

## ТРАНСПАРТ

Самастойна. Арэна спаборніцтваў знаходзіцца ў пешай даступнасці ад прыпынкаў грамадскага транспарту.

Аўтобусам 14 да прыпынку "Завулак Перамогі", арэна адразу за прыпынкам.

Аўт. 22, 28, трал. 5, 6, 23 да прыпынку "Вул. Выдавецкая" (ул. Издательская), адтуль 1 км пешшу.

***Схема, як даехаць ці дайсці на 2 дзень спаборніцтваў***



## ЗАЧЫНЕНЫЯ РАЁНЫ




[Раёны правядзення спаборніцтваў “Верас 2024” (Google мапы)]

## УМОВЫ ВЫЗНАЧЭННЯ ВЫНІКАЎ І ПАРАДАК УЗНАГАРОДЖВАННЯ

Асабістыя вынікі вызначаюцца па найменшым часе ў кожнай узроставай групе асобна. Камандныя вынікі вызначаюцца па 10 лепшых асабістых выніках згодна з табліцай:

| Место | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12… |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы, група Ж21Е, М21Е | 100 | 97 | 94 | 91 | 89 | 87 | 85 | 83 | 81 | 80 | 79 | 78… |
| Балы, астатнія групы | 80 | 77 | 74 | 71 | 69 | 67 | 65 | 63 | 61 | 60 | 59 | 58… |

Пераможцы і прызёры спаборніцтваў узнагароджваюцца ганаровымі граматамі і медалямі па выніках кожнага дня спаборніцтваў, акрамя груп МЖ8, Open1 і Open2. Па групах МЖ8, Open1 і Open2 пераможцы і прызёры не вызначаюцца, балы не прысвойваюцца. Усе ўдзельнікі МЖ8 атрымліваюць сувеніры.
Каманда-пераможца ўзнагароджваецца кубкам.

## АПЛАТА

- Аплата мэтавага ўзносу адбываецца альбо пры рэгістрацыі наяўным, альбо на разліковы рахунак БФА. У выпадку безнаяўнай аплаты неабходна мець з сабой раздрукаваную квітанцыю (ці даслаць яе на вайбер сакратару).
- Штраф за недаезд удзельніка – 50% стартавага ўзносу.

*СОО «Белорусская федерация ориентирования»*
*УНН: 100172873,*
*Адрес: 220015, г. Минск, ул. Одоевского, 115А, пом. 268,*
*БИК банка: UNBS BY2X,*
*Номер счета: BY21 UNBS 3015 1204 1310 4000 1933,*
*Банк: ЗАО "БСБ БАНК",*
*Адрес банка: г. Минск, пл. Свободы, 4.*
*Назначение платежа: Целевой взнос на организацию соревнований Верас 2024*

## ФІНАНСАВАННЕ

Выдаткі, звязаныя з арганізацыяй і правядзеннем спаборніцтваў, нясуць арганізатары. Выдаткі на ўдзел спартоўцаў у спаборніцтвах (праезд, харчаванне, пражыванне) нясуць арганізацыі, якія камандзіруюць спартоўцаў альбо самі спартоўцы.
Для забеспячэння правядзення спаборніцтваў удзельнікі альбо камандзіруючыя арганізацыі аплачваюць мэтавы ўзнос на арганізацыю спаборніцтваў.

| ГРУПЫ | сярэдняя | доўгая | 2 дні |
|---|---|---|---|
| МЖ 8 | – | бясплатна | – |
| МЖ 10-18, МЖ 75 | 15 BYN | 15 BYN | 25 BYN |
| МЖ 20, МЖ 65, Open1, Open2, МТВО Ж21, МТВО М21 | 20 BYN | 20 BYN | 40 BYN |
| МЖ 21-55 | 25 BYN | 25 BYN | 50 BYN |
| Арэнда эйр ЧЫПа | 2 BYN | 2 BYN | 4 BYN |

## ПРАЖЫВАННЕ

За арганізацыю пражывання ў гасцініцах і хостэлах г. Гродна ўдзельнікі адказваюць самастойна.

## КАНТАКТЫ

E-Mail: veras.orient@gmail.com

Інстаграм: @grodno.orient

## ПАРТНЁРЫ

SEVEN STARS
siding | windows | doors | gutters
remodeling

CITYRENT.BY
АПАРТАМЕНТЫ

FANCY

NADZEJKA

DREAM MAKERS

ГРОДФУД ®

Caanbag
for traveling

студия фитнеса и йоги
КИПАРИС

SOV. EST'
Украшения с душой ручной работы

КЛИНИКА ЖЕНСКОГО ЗДОРОВЬЯ

MySPORT
СПОРТИВНЫЙ МАГАЗИН

Юридическая помощь бизнесу
BS | Белявский
экономические споры